ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

Год выдання другі
№ 5 (46)
СУБОТА
3
КАСТРЫЧНІКА
1970 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Цана 2 кап.

## НОВЫ ТРЫУМФ САВЕЦКАЙ НАВУКІ І ТЭХНІКІ

### (ПАСПЯХОВЫ ПАЛЕТ САВЕЦКАЙ АЎТАМАТЫЧНАЙ СТАНЦЫІ «МЕСЯЦ-16»)

**Савецкай касмічнай навукай і тэхнікай бліскуча вырашана новая навукова-тэхнічная праблема. Упершыню ў гісторыі касманаўтыкі аўтаматычны апарат зрабіў рэйс Зямля—Месяц—Зямля і даставіў на Зямлю ўзоры месяцавай пароды.**

**Калектыў універсітэта разам з усім савецкім народам захапляецца новым выдатным дасягненнем айчыннай навукі і тэхнікі і жадае нашым вучоным, канструктарам, усім, хто ўдзельнічаў у рашэнні гэтай складанейшай праблемы, новых поспехаў у асваенні касмічнай прасторы.**

**У сувязі з гэтай падзеяй мы прапануем вашай увазе кароткі каментарый віднага вучонага, адзінага ў рэспубліцы аўтара навуковага адкрыцця, загадчыка кафедры фізікі цвёрдага цела нашага універсітэта, доктара тэхнічных навук, прафесара Дзмітрыя Мікалаевіча ГАРКУНОВА.**

Аўтаматычная станцыя «Месяц-16» пабыла на натуральным спадарожніку нашай планеты. Электрычны бур станцыі ажыццявіў бурэнне месяцавага грунту і ўзяў узоры пароды. Станцыя «Месяц-16» паспяхова стартавала з Месяца і ўдачна прызямлілася.

Гэты навуковы эксперымент належыць па праву лічыць вялікай перамогай у разведцы Сусвету.

Нас, спецыялістаў у галіне трэння і зносу цвёрдых цел, вельмі радуе тая акалічнасць, што нашы калегі, якія займаюцца распрацоўкай антыфрыкцыённых матэрыялаў для вузлоў трэння месяцавага буравога абсталявання, здолелі забяспечыць высокую надзейнасць гэтых вузлоў. Яны рашылі складаную тэхнічную задачу.

Сапраўды, звычайныя вузлы трэння, якія працуюць на Зямлі, не могуць дзейнічаць на Месяцы, бо там няма кіслароду. Такім чынам, не ўтвараюцца вокіславыя плёнкі на паверхнях, і тручыяся дэталі ў час работы зварваюцца. Вадкую змазку таксама ўжываць нельга, бо яна будзе выпарацца. Таму для гэтых вузлоў трэння неабходны матэрыялы, якія працуюць на новых прынцыпах. І, як мы бачым, вучоныя справіліся са складанай праблемай.

Паспяхова завершан яшчэ адзін касмічны эксперымент. Палёт станцыі «Месяц-16» уяўляе з сябе выдатнае дасягненне нашай навукі і тэхнікі, якое адкрывае новыя шырокія магчымасці для правядзення сістэматычных навуковых даследаванняў нябесных цел з дапамогай аўтаматычных апаратаў.

Мы ад усяго сэрца віншуем савецкіх вучоных, інжынераў, тэхнікаў, рабочых з вялікай перамогай у асваенні Космасу!

# СПРАВЕ ЛЕНІНА І ПАРТЫІ ВЕРНЫЯ

Урачыста і радасна адзначыў беларускі народ залаты юбілей камсамоліі рэспублікі. Гэтай знамянальнай даце быў прысвечан і агульнауніверсітэцкі камсамольскі сход «Запаветам Леніна верныя».

У актавай зале — выкладчыкі, ветэраны камсамола, студэнты (здымак унізе). Велічна гучаць дзяржаўныя гімны Савецкага Саюза і Беларусі. Раздаецца каманда «Унесці сцягі!». У залу ўдзельнікі студэнцкіх будаўнічых атрадаў Міхаіл Купрэеў, Леанід Арцёменка, Міхаіл Даніленка і Уладзімір Мядзведскі ўносяць сцягі універсітэта, узнагароды, атрыманыя за ўдарную работу ў час працоўнага семестра, за лепшую спартыўна-масавую работу сярод універсітэтаў краіны.




З дакладам «50 год Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі» выступіў намеснік сакратара камітэта камсамола Міхаіл Байда. Ён расказаў аб баявым шляху беларускай камсамоліі, аб яе поспехах у гады мірнага будаўніцтва і неўміручых подзвігах на франтах грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Міхаіл Байда падрабязна расказаў, з якімі дасягненнямі прыйшла універсітэцкая камсамольская арганізацыя да 50-годдзя ЛКСМБ, назваў імёны лепшых студэнтаў, пераможцаў агляду-конкурсу на лепшую камсамольска-прафсаюзную групу, праведзенага ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

Студэнты універсітэта не толькі добра вучацца, працягваў дакладчык, але і прымаюць актыўны ўдзел у рабоце навуковых гурткоў, выконваюць грамадскія даручэнні, працуюць у час летніх канікулаў на будоўлях краіны.

Сакратар камітэта камсамола фізічнага факультэта Аня Гадлеўская расказала аб тым, як студэнты шэфствуюць над піянерамі, аб іх дапамозе ў абсталяванні вучэбных кабінетаў.

Студэнтка 5 курса біёлага-глебавага факультэта Зінаіда Кухарава паведаміла ўдзельнікам урачыстага сходу, што яе аднакурснікі сталі на вахту, прысвечаную дастойнай сустрэчы XXIV з'езда КПСС і імкнуцца сустрэць гэту вялікую падзею ў жыцці нашай краіны добрай і выдатнай вучобай.

Ад імя парткома універсітэта камсамолец трыццатых гадоў дацэнт Яўген Антонавіч Семянчук (здымак уверсе) цёпла павіншаваў моладзь са святам.



На ўрачыстым сходзе таксама выступілі старшыня савета СНТ універсітэта Аляксандр Сінюк і сакратар камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта Валянціна Апалькова.

За поспехі ў вучобе і актыўны ўдзел у грамадскай рабоце шасці студэнтам ГДУ былі ўручаны Ганаровыя граматы Гомельскага абкома камсамола.

Узнагароды калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і бюро ЦК ЛКСМБ атрымалі многія студэнты, якія ўдзельнічалі ў рэспубліканскім конкурсе работ па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Удзельнікі ўрачыстага юбілейнага сходу аднагалосна прынялі сацыялістычныя абавязацельствы камсамольскай арганізацыі універсітэта па дастойнай сустрэчы XXIV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Сход закончыўся спяваннем партыйнага гімну «Інтэрнацыянал».

**Наш кар.**

# САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

### КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ПА ДАСТОЙНАЙ СУСТРЭЧЫ XXIV З'ЕЗДА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

**Рыхтуючыся дастойна сустрэць XXIV з'езд КПСС, у дзень слаўнага 50-годдзя камсамола Беларусі камсамольская арганізацыя Гомельскага дзяржаўнага універсітэта абавязуецца:**

**Лічыць усю работу накіраванай на дастойную сустрэчу XXIV з'езда КПСС.**

**Замацаваць поспехі ў вучобе, дасягнутыя па выніках мінулага навучальнага года, дабіцца, каб грамадскія дысцыпліны здаць на «добра» і «выдатна».**

**Прыняць актыўны ўдзел у святкаванні 150-годдзя з дня нараджэння Фрыдрыха Энгельса.**

**Палепшыць прапагандысцкую і лектарскую работу школы маладога лектара.**

**Працягваць шэфскую работу ў сельскіх школах. Абавязаць камсамольскую арганізацыю факультэта фізічнага выхавання дапамагчы школам у будаўніцтве спартыўных пляцовак і набыцці спортінвентару.**

**Гурткі мастацкай самадзейнасці абавязуюцца часцей выступаць з канцэртамі ў горадзе і вобласці, палепшыць якасць выканаўчага майстэрства.**

**Палепшыць работу студэнцкага навуковага таварыства, падрыхтаваць 50 работ на рэспубліканскі конкурс па праблемах грамадскіх навук.**

**Для работы на будоўлях краіны летам 1971 года сфарміраваць студэнцкія будаўнічыя атрады ў колькасці 600 чалавек.**

**Напярэдадні XXIV з'езда КПСС правесці сустрэчы са старымі камуністамі, дэлегатамі з'ездаў нашай партыі, лепшымі людзьмі горада і вобласці.**

**Да XXIV з'езда КПСС актыўна ўключыцца і паспяхова здаць ленінскі залік, які праводзіцца пад дэвізам «Мы справе Леніна і партыі верныя».**

**САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ПРЫНЯТЫ НА АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКІМ ЮБІЛЕЙНЫМ КАМСАМОЛЬСКІМ СХОДЗЕ.**

## ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За актыўны ўдзел у гаспадарчым і культурным будаўніцтве, плённую работу па камуністычнаму выхаванню моладзі і ў сувязі з 50-годдзем ЛКСМБ Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў граматамі вялікую групу маладых перадавікоў прамысловасці, будаўніцтва, транспарту, сельскай гаспадаркі, работнікаў камсамольскіх органаў, маладзёжнага друку, культуры і навучальных устаноў.

У ліку ўзнагароджаных Граматай Вярхоўнага Савета БССР

**БАЙДА** Міхаіл Ляонцьевіч — студэнт універсітэта;

**ЭСМАНТОВІЧ** Ігар Феафілавіч — сакратар камітэта камсамола універсітэта.

